Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з І квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 2 (56)'2007

Репозиторий БГПУ

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**М. І. МІНІЦКІ** — галоўны рэдактар, *кандыдат гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ** — першы намеснік галоўнага рэдактара, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА** — намеснік галоўнага рэдактара, *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА** — адказны сакратар
**І. І. БАГДАНОВІЧ**, *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ**, *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН**, *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА**, *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ** — старшыня
**М. М. ЗАБАЎСКІ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА**, *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН**, *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

220070, г. Мінск, вул. Будзённага, 21; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

БПГУ + 37 (476)



# ПРАБЛЕМЫ АДУКАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ, ШКОЛЫ І ШКОЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ НА СТАРОНКАХ «НАШАЙ НІВЫ» Ў 1906–1908 ГАДАХ

**Да 100-годдзя выхаду ў свет газеты «Наша ніва»**

*Віктар Пілецкі, доктар гістарычных навук,*
*прафесар кафедры гісторыі Беларусі БДПУ імя Максіма Танка*

***Мэта артыкула — даць рэфератыўны агляд зместу публікацый газеты «Наша ніва», прысвечаных праблемам эвалюцыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу, школы і школьнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі ад першых нумароў да канца 1908 г. Матэрыял можа спатрэбіцца ў якасці даведачнага ці дыдактычнага як пры вывучэнні адпаведнага перыяду гісторыі Беларусі ў звычайных навучальных установах, так і для выкарыстання ў класах з паглыбленай формай вывучэння гуманітарных прадметаў, на спецкурсах у гімназіях і каледжах.***

Газета «Наша ніва», першае сталае беларускамоўнае грамадска-палітычнае выданне, адыграла выключна важную ролю ў аднаўленні дзяржаўнага статуса беларускага народа. Але палітычная барацьба была не адзінай праблемай, якая хвалявала рэдакцыю і шырокае кола чытачоў. У газеце знаходзіла адлюстраванне эканамічнае жыццё краіны, праблемы мовы, культуры народа, а таксама шмат іншых пытанняў, якія закраналі практычна ўсе бакі існавання тагачаснага грамадства [1].

Востраму абмеркаванню падлягалі і пытанні эвалюцыі школы і школьнай палітыкі. «Наша ніва» як выразнік інтарэсаў грамадства акумулявала ў сабе ўсё тое, што хвалявала яго ў сувязі з эвалюцыяй школьнага жыцця, інакш кажучы, яна была «люстэркам», у якім было бачна жыццё тагачаснага грамадства і ў галіне выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

Выключную важнасць мела і тое, што матэрыялы публікаваліся на беларускай мове. Гэта спрыяла фарміраванню беларускай нацыі і з'яўлялася моцным стымулам нацыянальнага адраджэння. Вакол газеты гуртаваліся прагрэсіўныя грамадска-палітычныя сілы, адбывалася апрацоўка праграм беларускіх палітычных партый, з'ядноўвалася нацыянальна свядомая частка грамадства на падставе прыхільнасці да беларускай ідэі.

Усё сказанае не можа быць поўным пералікам велізарнай працы, якая была ажыццёўлена супрацоўнікамі газеты і палітычнымі сіламі, што выдавалі газету, выступалі яе фундатарамі і абаронцамі ў складаных умовах палітычнай барацьбы. Цікавым аспектам уяўляецца дзейнасць «Нашай нівы» ў барацьбе за нацыянальную беларускую школу. Паказальная яе падтрымка прагрэсіўнай эвалюцыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў краіне і барацьба за народную школьную палітыку. Паспрабуем коратка праілюстраваць гэ-

Рэпазіторый БДПУ

тую справу на матэрыялах асобных публікацый у газеце.

З 26 нумароў, якія пабачылі свет за тры гады яе існавання (1906–1908), праблемы школы, выхаваўча-адукацыйнага працэсу і школьнай палітыкі ўзнімаліся шмат разоў, прычым гэта былі як спецыяльныя матэрыялы, прысвечаныя названай тэматыцы, так і заўвагі аб школьных праблемах, што былі састаўной часткай публікацый іншай тэматыкі. Спынімся на публікацыях, якія непасрэдна акрэслівалі названае кола пытанняў і былі прысвечаны іх высвятленню.

У самым першым нумары за подпісам «Мацей Крапиука» змешчаны артыкул пад назвай «Як нам учыцца», што сведчыць пра надзвычай вялікую важнасць праблем школы сярод пытанняў, якія пазначылі для сябе аўтары газеты (*тут і далей у назвах артыкулаў і прозвішчах аўтараў мы захоўваем арыгінальную арфаграфію, дадзеную ў газеце — **В. П.***) [2, с. 4–5].

Найважнейшай задачай школьна-палітычнага кшталту для беларускага народа ў той час, як вядома, была праблема барацьбы за беларускую пачатковую школу. Аўтар пры дапамозе даволі вытанчанага своеасаблівага мастацка-публіцыстычнага стылю пачатку XX ст. зрабіў уступ пра неабходнасць навучання ўвогуле, якое вядзе да лепшай будучыні, і адзначыў, што цяпер, калі народы сталі намнога больш свабоднымі, усе суседзі (палякі, літоўцы, яўрэі і інш.) пачыналі даволі інтэнсіўна весці барацьбу за навучанне дзяцей на роднай мове. А гэта значыць, што і беларусам ужо даўно патрэбна распачынаць працу па арганізацыі нацыянальных беларускіх школ.

Рэдакцыя вырашыла звярнуцца зноў да праблемы беларускай нацыянальнай школы. У 4 нумары газеты быў змешчаны артыкул за подпісам «Янка Белый, писулька да Рэдакции» пад назвай «Беларуская народная школа». Аўтар, акрамя гарачай і эмацыянальнай падтрымкі ідэі неабходнасці беларускай нацыянальнай школы, падзяліўся вопытам барацьбы за польскую школу, якую вялі ў той час польскія нацыянальна-палітычныя сілы. Яны арганізавалі суполку «Мацерж Польска», чым прыцягнулі значную колькасць прыхільнікаў польскамоўнага навучання дзяцей этнічных палякаў, а такса-ма фундатараў, палітыкаў і іншыя сілы, якія распачалі шырокамаштабную прак-тычную справу па адкрыцці польскамоў-ных школ. На думку аўтара, беларусам таксама патрэбна было як мага хутчэй пе-раняць гэты вопыт і ўзяцца за практычную арганізацыю, заканадаўчае афармленне і адкрыццё беларускіх школ [3, с. 5–6].

У № 7 «Нашай нівы» выйшла яшчэ адна публікацыя, прысвечаная школьна-палітычным праблемам, за подпісам «Дзядзька Карусь». Яе назва: «Беларус-кая мова у казенной школи» — была да-дзена пад спецыяльнай рубрыкай «Бела-руская народная школа». Аўтар з дапамо-гай выдатнага народна-патрыятычнага публіцыстычнага стылю заўважыў, што цяпер, калі беларусам нарэшце дазволі-лі гаварыць і пісаць на іх роднай мове, з'явя-лася шмат адкрытых праціўнікаў белару-ска слова. Яны не проста не хочуць ра-маўляць на ёй, але, што самае горшае, пішуць, што беларуская мова «мёртвая», «брыдкая», «нераспрацаваная» і на ёй маўляў, нельга выказаць навуковы думкі. Акрамя гэтага яны імкнуцца вы-смейваць дзетак беларусаў у навучальны установах за беларускамоўную гаворку. Прычым робяць гэта перш за ўсё ў дачы-ненні да тых, якія паўсядзённа размаўля-юць на роднай мове. Пры гэтым ствара-ся ўмовы для таго, каб вучні саромелі-сваіх нацыянальных каранёў.

Выснова, якую робіць публіцыст, за-ключаецца ў тым, што беларусы — надзв-чай моцная нацыя, а беларуская мов-можа, нават больш трывалая ў параўнан-з суседнімі. Нягледзячы на тое, што працягу некалькіх стагоддзяў яе выні-чалі і забаранялі, яна не знікла з гіс-рычнай арэны. Менавіта гэта і ёсць сам-відавочны аргумент нядобразычліўцам, таксама паказчык трываласці беларуск-моўнай традыцыі. Гэта, безумоўна, і п-казчык гістарычнай перспектывы Белару-і беларусаў як асобнага этнасу [4, с. 4].

Шаснаццатага сакавіка 1907 г. рэда-цыя зноў звярнулася да набалела-школьнага пытання. Артыкул «Аб наці-нализации школы (голас вучыцеля-белар-са)» быў падпісаны псеўданімам «Нар-ны вучыцель». Аўтар заўважыў, што ц-пер, калі «...бліснулі дні свабоды...», у-народы Расійскай імперыі ўзяліся за в-рашэнне пытання пераходу навучання



Репозиторий БГПУ

нацыянальныя мовы. На яго думку, гэта адна з найважнейшых задач, якая стаіць і перад беларускім народам. Прычым важнасць яе, як разважае аўтар, не меншая, чым надзённыя матэрыяльныя ці іншыя праблемы як асобнага чалавека, так і грамадства ўвогуле, бо без вырашэння гэтай задачы спадзявацца на лепшае жыццё наўрад ці магчыма. Калі народ даб'ецца пераадолення цемрашальства праз асвету на роднай мове, «...толькі тагды народ знойдзець и праўдзивую дарогу, каб дабицца лепшай доли» [5, с. 3–4].

У артыкуле дадзена крытыка ўрадавай палітыкі, якi, з аднаго боку, дазволіў навучаць дзяцей на нацыянальных мовах, але, разам з тым, на думку аўтара, нічога не зрабіў дзеля ажыццяўлення гэтага. І таму там, дзе патрыёты адразу ж узяліся за арганізацыю нацыянальных школ (як, напрыклад, у Польшчы і Літве, вядомых сваім моцным пачуццём нацыянальнай годнасці і самасвядомасці), яны ўжо і дзейнічаюць, а беларускаму насельніцтву трэба таксама як мага найхутчэй паклапаціцца пра пашырэнне гэтай справы.

У артыкуле гаворыцца і пра пашырэнне нацыянальнай украінскай школы. І, што вельмі важна, нават прыведзены тэкст спецыяльнай петыцыі да ўрадавых органаў ад вучняў Глухоўскага настаўніцкага інстытута, дзе сфармулявана просьба аб дазволе пашырыць украінскую мову навучання ў школах рэгіёна. Тым самым нашаніўцы імкнуліся не толькі тлумачыць неабходнасць барацьбы за нацыянальную школу, але і прыводзілі матэрыялы, якія маглі быць выкарыстаны ў якасці практычнага дапаможніка, узору для складання і падачы падобных заяў у межах Беларусі. Інакш кажучы, газета была не толькі дарадчыкам насельніцтву краіны, але нават спрыяла практычнай арганізацыі шырокага народнага руху ў барацьбе за нацыянальную беларускую школу.

Трынаццаты нумар газеты за 30 сакавіка 1907 г. пад рубрыкай «Лист да Рэдакцыи» змяшчае ліст «Филимона М.». Ён выпрашыў адгукнуцца на артыкул «Аб национализации школы», напісаны «Народным вучыцелем». Аўтар пагаджаецца з апошнім і заўважае, што звароты да ўрада наўрад ці што добрае дадуць, было б намнога лепей, калі б беларускае насельніцтва стварыла сваю ўласную суполку — «Матку Беларускую», — падобную на тую, што ўжо дзейнічае ў Польшчы. Толькі яна, на думку аўтара ліста, магла б стварыць сапраўды дзейсныя беларускамоўныя вучылішчы для дзяцей беларусаў. Толькі вучылішчы, арганізаваныя самім насельніцтвам Беларусі, могуць вучыць дзяцей так, як трэба, лічыць «Филимон М.». У канцы свайго допісу аўтар звяртаецца да «Вельможнай Рэдакцыи» газеты «Наша ніва» з заклікам «...заняцца гэтай святой справай усур'ёз і клікнуць ва ўсе чатыры канцы свету да людзей добрай волі...», каб яны падтрымалі ідэю стварэння суполкі «Матка Беларуская», якая б прывяла да стварэння сапраўды нацыянальнай, беларускай школы на тэрыторыі Беларусі. І толькі тады, мяркуе падпісант, сапраўды «...заглянець сонцэ ў кожнае ваконцэ» [6, с. 8].

Яшчэ адзін артыкул, прысвечаны эвалюцыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу, школы і школьнай палітыкі ў Беларусі, апублікаваны ў № 20 за 25 мая 1907 г. пад назвай «Аб народным вучыцелю» за подпісам «К. Наднеманец». Ён прысвечаны высвятленню надзвычай цяжкага становішча, у якім знаходзіліся тагачасныя настаўнікі. Падкрэслена, што ўлады імперыі лёгка кідаюць у турмы і адпраўляюць у ссылкі тых настаўнікаў, якія асмеліліся думаць іначай, чым прадпісвае ім цыркуляр кіраўніцтва. Тое ж чакае і тых, якія імкнуцца «...пралиць луч сьвета у цёмную вёску» або пасмелі выйсці за вузкія рамкі вучэбнай праграмы міністэрства. Іх або садзяць у турмы і высылаюць у самыя аддаленыя ўскраіны Расіі, або выганяюць з працы, асуджаючы на паўгалоднае, жабрацкае існаванне. Разам з настаўнікамі выганяюць са школ і найлепшых вучняў, якія таксама не пабаяліся выступіць у абарону занядбанай народнай долі.

Цяжка жывецца і тым настаўнікам, зазначае аўтар артыкула, якія пакуль яшчэ застаюцца ў школах, але не схіляюць галаву перад уладамі. Жывуць добра толькі настаўнікі-чарнасоценцы, «...чыя галава низка клоница перад цэшкаю станавога прыстава». «К. Наднеманец» падкрэсліў, што сумленныя педагогі ніколі не бачылі дабра, усё іх жыццё — адна пакута. Над імі стаіць велізарная колькасць начальнікаў. Гэта і праваслаўны поп, і пісар, і старшыня, і стараста, і ўраднік, і стражнік, і многія



Репозиторий БГПУ

іншыя. Прычым кожны з іх імкнецца як мага больш балюча «...скубянуць вучыцеля...», а то і ўвогуле «ўкусіць» яго. Аўтар вырашыў завяршыць свае разважанні пра цяжкую настаўніцкую долю рытарычным пытаннем-поклічам: «калі-ж дачакаеш ты лепшай доли, пакутник-вучыцель, чорны волик на пустой ниве народнага абразавання?» [7, с. 6].

Калі гаварыць пра выхаваўча-адукацыйны працэс з пункта гледжання пашырэння ведаў і навыкаў, нельга не адзначыць і артыкул-інструкцыю «Як аткрываць библиотэки у мястэчках и вйосках», апублікаваны ў № 25 ад 20 ліпеня 1907 г. без подпісу. Наяўнасць такой інструкцыі, практычнага дапаможніка аб адкрыцці бібліятэк — гэта яшчэ адно пацвярджэнне таго, што «Наша ніва» была не толькі газетай у сучасным разуменні слова (як публіцыстычнае выданне), але яна яшчэ выконвала і ролю практычнага дапаможніка насельніцтву Беларусі ў розных галінах жыцця грамадства. Прычым, як бачна, і ў сферы выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

У артыкуле ў даволі сціслым выглядзе змешчаны найважнейшыя рэкамендацыі аб тым, як можна адкрыць бібліятэку ў асобным населеным пункце. Сабраны звесткі аб падпарадкаванасці розных бібліятэк асобным ведамствам (губернатар, папячыцель вучэбнай акругі ці праваслаўна-царкоўнае ведамства), дадзены прыкладныя тэксты неабходных дакументаў і інш. [8, с. 5].

У № 35 за 7 снежня 1907 г. апублікавана кароткая заметка пра забастоўку тысячы студэнтаў Кіеўскага універсітэта, што адбылася 17.11.1907 г. Маладыя людзі выступілі за дазвол наведваць заняткі 153 студэнтам, якіх пазбавілі гэтага права да пачатку прафесарскага суда, што павінен быў разглядаць іх справу пра ўдзел у абароне правоў народа. Скончылася ўсё арыштам і выгнаннем з універсітэта 719 чалавек, а таксама хваляй забастовак у студэнцкім асяроддзі па ўсёй краіне і, адпаведна, масавымі выключэннямі студэнтаў з універсітэтаў. Асабліва маштабнымі былі выгнанні з ліку студэнтаў у навучальнай установе пад назвай «Вышэйшыя жаночыя курсы» [9, с. 7].

Яшчэ адна падзея — закрыццё варшаўскім генерал-губернатарам дабрачынна-асветніцкай суполкі, што займалася
зборам ахвяраванняў і адкрыццём польс
моўных школ «Мацерж Польска», — 
служыла прычынай з'яўлення замет
ў «Нашай ніве» за 21 снежня 1907 г. У
акрэслены велізарныя маштабы дзейнас
гэтай дабрачыннай арганізацыі. Так, н
прыклад, адзначана, што таварыства «М
церж Польска» складалася з больш ч
780 мясцовых арганізацый (аддзелаў
аб'ядноўвала прыблізна 116,5 тыс. чал
век. За час сваёй дзейнасці гэта тавар
ства апекавала сваімі грашовымі сродка
чатыры польскамоўныя гімназіі, а так
ма адкрыла і выступала фундатар
141 школы, 317 прытулкаў, 505 бібліят
і чытальняў, не лічачы шматлікіх курс
лікбезу і іншых асветніцкіх устан
Цікава, што ўся гэта праца вялася 
кошт дабрачынных ахвяраванняў, 
сведчанне вялікай колькасці людзей
Польшчы, гатовых самаахвярна працава
на карысць свайго народа [10, с. 6].

У 1908 г. «Наша ніва» працягвала 
стойваць ідэю ўсталявання беларускай н
цыянальнай пачатковай школы, распач
тую яшчэ ў першыя месяцы свайго іс
вання. Акрамя гэтага, яна, як і на па
рэднім этапе, адгукалася на найважне
шыя падзеі школьна-палітычнай эвал
цыі грамадства на тэрыторыі Белару
Расійскай імперыі і народаў-суседзяў 
з блізкага, так і з далёкага замежжа.

Пачатак 1908 г. быў азнаменаваны с
ноўчай тэндэнцыяй у развіцці працэсу 
рацьбы за ўкараненне нацыянальнай ш
лы. У № 1 за 4 студзеня 1908 г. «На
ніва» паведаміла аб тым, што ў г. Віл
адкрылася грамадская арганізацыя («В
ленское Общество Образованія»), як
мела на мэце развіццё адукацыі і асвет
Тая ж справа распачалася і ў г. Вілей
дзе існуе арганізацыйны камітэт д
стварэння падобнай арганізацыі. Тра
заўважыць, што гэта не былі выключ
беларускія таварыствы, якія б імкнулі
працаваць у напрамку развіцця ідэі бел
рускамоўнага навучання. Гэта былі ар
нізацыі з больш шырокімі мэтамі і нац
янальным прадстаўніцтвам. Яны факты
на адлюстроўвалі этнічную сітуацыю 
беларускіх землях на той час, таму што
іх складзе былі прадстаўнікі пяці народаў
жыхароў Беларусі [11, с. 5].

Асаблівасць названых суполак, як п
крэслена ў газеце, у тым, што яны з'

Репозиторий БГПУ

ляюцца шматнацыянальнымі і складаюцца з пяці нацыянальных аддзелаў (па ліку прадстаўленых там нацыянальнасцей: літоўцаў, палякаў, яўрэяў, беларусаў і рускіх). А таксама ў тым, што яны, згодна з заяўленымі мэтамі сваіх статутаў, будуць займацца справай арганізацыі школьнага навучання (ніжэйшага, сярэдняга і вышэйшага), а таксама навучаннем без школ, друкаваннем кніг, выданнем газет, арганізацыяй публічных лекцый, чытанняў, устаноў школьнага тыпу, бібліятэк і інш. «Наша ніва» адобрыла ідэю з'яўлення гэтых арганізацый і заклікала насельніцтва Беларусі падтрымаць працу беларускай секцыі таварыства. У артыкуле быў выказаны заклік арганізоўваць падобныя беларускія секцыі ў іншых гарадах краіны і развіваць гэтую надзвычай важную і актуальную працу.

Литература

1. Першая беларуская газета з рысункамі. — Вып. 1. — 1906–1908 гг. Факсімільнае выданне / адк. за вып. З. Ф. Санько. — Мінск, 1992.
2. *Крапиука, М.* Як нам учыцца / М. Крапиука // Наша ніва. — 1906. — № 1.
3. *Белый, Я.* Беларуская народная школа / Я. Белый // Наша ніва. — 1906. — № 4.
4. *Карусь, Д.* Беларуская мова у казенной школи / Д. Карусь // Наша ніва. — 1906. — № 7.
5. Аб национализации школы // Наша ніва. — 1907. — № 11.
6. *Филимон, М.* Лист да Рэдакции / М. Филимон // Наша ніва. — 1907. — № 13.
7. *Наднеманец, К.* Аб народным вучыцелю / К. Наднеманец // Наша ніва. — 1907. — № 20.
8. Як аткрываць библиотэки у мястэчках и вйосках // Наша ніва. — 1907. — № 25.
9. З Киеускаго Унивэрсытэта // Наша ніва. — 1907. — № 35.
10. Польская Маци Школьная // Наша ніва. — 1907. — № 36.
11. Новае товарыство для шырэньня асьветы // Наша ніва. — 1908. — № 1.

*Заканчэнне будзе*

# ОТЗВУКИ АНТИЧНОЙ КУЛЬТУРЫ В ПОВСЕДНЕВНОЙ ЖИЗНИ СОВРЕМЕННОГО ГОРОДА

***Нинель Гончарова, кандидат филологических наук, профессор БГУ***

... панталоны, фрак, жилет,
Всех этих слов на русском нет.
**А. С. Пушкин**

На фоне разговоров о патриотизме и национальной гордости складывается впечатление, что происходит процесс некой оппозиции национальной принадлежности путем использования в языке повседневного общения слов и выражений иностранного происхождения. В последнее время особенно бросается в глаза обилие иностранных названий на вывесках торговых предприятий, клубов, салонов, выставочных центров, кафе, баров, ресторанов и других заведений общественного обслуживания города Минска. Обращает на себя внимание тот факт, что среди этого пестрого французского, английского, испанского, итальянского и даже китайского разноязычия численно выделяются названия греко-латинского происхождения. В принципе использование элементов античной культуры в науке, технике и в известной степени в повседневности не является чем-то необычным. Лучшими

Репозиторий БГУ